# Вобразы старажытнай Беларусі

***Нядаўна ў галерэі «Мабільная» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ў межах Года народнага адзінства стартавала мастацкая выстаўка «Старажытная Беларусь», прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння беларускага гісторыка Міколы Ермаловіча. Яе арганізатарамі выступілі НББ і Беларускі саюз мастакоў.***

На адкрыцці з прывітальным словам да прысутных звярнулася першы намеснік генеральнага дырэктара НББ Алена Далгаполава. Цёплымі словамі пра лёс даследчыка падзялілася вядучы бібліятэкар аддзела абслугоўвання спецыялізаванымі фондамі Яўгенія Галіеўская. Пра працу над выстаўкай распавялі: мастацтвазнаўца, мастацкі крытык, куратар і галерыст, старшыня секцыі крытыкі і мастацтвазнаўства Беларускага саюза мастакоў Мікалай Пагранoўскі; кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Уладзімір Сосна; мастак, сябра Беларускага саюза мастакоў, культурны дзеяч, куратар выстаўкі Мікола Купава. Усе выступоўцы падкрэслілі неверагодны ўклад М. Ермаловіча ў культуру і гісторыю краіны.



Гісторык, публіцыст, паэт, выкладчык беларускай літаратуры М. Ермаловіч друкаваў крытычныя і літаратуразнаўчыя артыкулы, вывучаў гістарычныя першакрыніцы і працаваў над нарысамі пра старажытную Беларусь. Даследчык быў заснавальнікам новай рамантычнай гістарыяграфіі, адмаўляў версію заваявання беларускіх земляў аўкштайтамі (пазней летувісамі), выказаў здагадку пра сёння ўжо пацверджаных межах старажытнай Беларусі. Вынікам яго даследчай працы сталі кнігі «Па слядах аднаго міфа», «Дарагое беларусам імя», «Старажытная Беларусь: Полацкі і Новагародскі перыяды», «Старажытная Беларусь: Віленскі перыяд», «Беларуская дзяржава Вялікае Княства Літоўскае», якія захоўваюцца ў фондзе НББ. Яго творчасць адзначаная Дзяржаўнай прэміяй Беларусі, прэміяй імя У. Караткевіча, медалём Францыска Скарыны.

Выкліканую Ермаловічам дыскусію і ўклад у акадэмічную гісторыю Беларусі цяжка пераацаніць. Выдатны дзеяч культуры, менавіта ён заахвоціў па-новаму паглядзець на шматлікія падзеі і даты ў айчыннай гісторыі, перагледзець ацэнкі асобаў дзеячаў старажытнай і сярэднявечнай Беларусі, вярнуў беларусам спадчыну – ВКЛ. Яго даследаванні моцна паўплывалі на сферу культурнага жыцця, новае ўспрыманне гісторыі краіны знайшло адлюстраванне ў літаратуры і мастацтве.

У экспазіцыі «Старажытная Беларусь» – жывапіс і графіка беларускіх мастакоў, мастацкі водгук на даследаванні Міколы Іванавіча. Прадметамі выяўлення сталі не толькі падзеі старажытных часоў, але і вобразы пазнейшых стагоддзяў, аб'яднаныя зацікаўленасцю гісторыяй беларускай Літвы: выдавецтвы, у якіх друкаваліся кнігі беларускіх аўтараў, этнаграфічныя матэрыялы, першая газета на беларускай мове «Наша доля», ілюстрацыі да «Пана Тадэвуша», энцыклапедыі шляхецкага побыту... Творы Паўла Татарнікава, Міхаіла Басалыгі, Васіля Шаранговіча, Канстанціна Вашчанкі, Сафіі Піскун, Аляксандра Кошалева, Таццяны Фаміной, Віктара Варанкевіча, Яўгеніі Сухаверхавай і іншых мастакоў гучаць ва ўнісон старонкам кніг даследчыка.

Адчуць атмасферу вобразаў старажытнай Беларусі можна да 22 чэрвеня.

Таксама ў бібліятэцы ў зале беларускай літаратуры працавала кніжная выстаўка «Шлях да вечнасці», прысвечаная даследчай дзейнасці М. Ермаловіча.

***Паводле інфармацыі арганізатараў***